**Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў** (нар. 1931) — расійскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, першы і адзіны Прэзідэнт СССР (1990—1991). Працоўную дзейнасць пачаў з 15 гадоў механізатарам МТС. Скончыў юрыдычны факультэт МДУ. Затым перайшоў на камсамольскую, а пасля на партыйную працу. У 1970 г. стаў самым маладым першым сакратаром райкама партыі і праз год быў абраны ў склад ЦК КПСС. Вылучаўся мэтанакіраванасцю, напорыстасцю, высокай працаздольнасцю. У 1980 г. стаў самым маладым членам Палітбюро. У сакавіку 1985 г. быў аднагалосна выбраны Генеральным сакратаром ЦК і пачаў перабудову. Удастоены Нобелеўскай прэміі міру «ў знак прызнання яго істотнай ролі ў мірным працэсе» (1990).



# § 37. Расійская Федэрацыя

*1. Якія перыяд гісторыі СССР называюць перабудовай? 2. Калі была ўтворана Садружнасць Незалежных Дзяржаў?*

РСФСР, найбуйнейшая па тэрыторыі і колькасці насельніцтва рэспубліка, дамінавала ў СССР. Аднак уласнай дзяржаўнасці ў савецкі перыяд яна фактычна не мела. Палітыка перабудовы прывяла да распаду СССР, стварэння на яго тэрыторыі незалежных дзяржаў, у тым ліку Расійскай Федэрацыі.

**Расія на шляху да суверэнітэту.** Працэс палітычнага рэфармавання РСФСР пачаўся пасля выбараў народных дэпутатаў у сакавіку 1990 г. У выніку гэтых выбараў каля паловы дэпутацкіх месцаў атрымалі прадстаўнікі дэмакратычных сіл, лідарам якіх стаў былы першы сакратар Маскоўскага гаркама КПСС Б. М. Ельцын. У маі 1990 г. ён быў абраны старшынёй Вярхоўнага Савета РСФСР.



Інаўгурацыя Прэзідэнта РСФСР Б. М. Ельцына. 1991 г.

Важнымі крокамі на шляху пабудовы новай дзяржаўнасці сталі прыняцце *Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР*, якое адбылося *12 чэрвеня 1990 г.*, і ўвядзенне пасады прэзідэнта РСФСР, які выбіраўся ўсенародна. Уся паўната суверэнітэту цяпер належала Расіі ў асобе яе найвышэйшых дзяржаўных органаў. Першым Прэзідэнтам РСФСР *12 чэрвеня 1991 г.* быў абраны Б. М. Ельцын. Расія

Правообладатель Издательский центр БГУ

аднавіла свае гістарычныя дзяржаўныя сімвалы і стала афіцыйна называцца *Расійскай Федэрацыяй (РФ)*, або *Расіяй*. Расійскае грамадства ўступіла ў паласу складанай і супярэчлівай трансфармацыі.

**Радыкальная эканамічная рэформа.** У выніку жнівеньскіх падзей 1991 г. і распаду СССР да ўлады ў Расійскай Федэрацыі прыйшлі радыкальна настроеныя рэфарматары. Іх лідары былі апантанымі прыхільнікамі свабодных рыначных адносін. Яны лічылі, што свабодны рынак зменіць эканоміку Расіі, сфарміруе сярэдні клас і закладзе ўстойлівыя асновы палітычнай дэмакратыі.

*Якія вынікі мела радыкальная эканамічная рэформа пачатку 1990-х гг.?*

Стаўку зрабілі на жорсткія сродкі паскоранай лібералізацыі і палітыку «шокавай тэрапіі». У 1992—1993 гг. рэфарматары ажыццявілі шэраг мерапрыемстваў, найважнейшымі з якіх былі ўвядзенне вольных цэн, лібералізацыя гандлю і прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў і жылля.

Першыя вынікі рэформаў пераўзышлі самыя змрочныя чаканні і мелі драматычныя наступствы. Цэны ўзраслі больш як у 10 разоў. Рост зарплаты і пенсій не паспяваў за ростам цэн. Далейшае правядзенне палітыкі «шокавай тэрапіі» прывяло да банкруцтва прадпрыемстваў лёгкай і абароннай прамысловасці, сельскагаспадарчага комплексу. Большасць насельніцтва апынулася за мяжой беднасці, а надзеі на фінансавую дапамогу Захаду не спраўдзіліся. У грамадстве расла масавая незадаволенасць. Урадавы курс на радыкальныя рэформы і «шокавую тэрапію» не быў падтрыманы Вярхоўным Саветам Расійскай Федэрацыі.

**Кастрычніцкія падзеі 1993 г. і прыняцце Канстытуцыі РФ.** *Восенню 1993 г.* паміж заканадаўчай і выканаўчай уладай узнік востры палітычны канфлікт. У цэнтры яго было пытанне аб форме дзяржаўнага ладу ў Расіі: быць краіне парламенцкай або прэзідэнцкай рэспублікай. 21 верасня 1993 г. Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Б. М. Ельцын выдаў указ аб спыненні паўнамоцтваў найвышэйшых органаў заканадаўчай улады — З’езда народных дэпутатаў і Вярхоўнага Савета. Замест іх меркавалася стварэнне прафесійнага парламента, які б складаўся з дзвюх палат — *Дзяржаўнай Думы* і *Савета Федэрацыі*. Аднак Вярхоўны Савет не падпарадкаваўся ўказу, лічачы дзеянні Прэзідэнта антыканстытуцыйнымі, і зрабіў спробу стварэння новага ўрада. У адказ Прэзідэнт Ельцын звярнуўся да сілавых дзеянняў.



Танкі абстрэльваюць будынак Вярхоўнага Савета Расіі. Масква. Кастрычнік 1993 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

3—4 кастрычніка будынак Вярхоўнага Савета быў блакаваны, абстраляны і ўзяты штурмам войскамі, а кіраўнікі супраціўлення арыштаваны.

Вынікам трагічных падзей стала радыкальнае змяненне палітычнай сістэмы расійскага грамадства. Новая Канстытуцыя, прынятая ў выніку рэферэндуму *12 снежня 1993 г.*, завяршыла працэс ліквідацыі сістэмы Саветаў народных дэпутатаў. Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі надзяляўся шырокімі паўнамоцтвамі, атрымаў права назначаць кіраўніка ўрада, распускаць Дзяржаўную Думу і абвяшчаць новыя выбары. Расія, такім чынам, станавілася *прэзідэнцкай рэспублікай*.

№ 36

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Расіі ў 1994—1999 гг.** Радыкальная эканамічная рэформа ў цэлым завяршылася да сярэдзіны 1994 г. Яе вынікам стала разбурэнне камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання і стварэнне асноў рыначнай капіталістычнай эканомікі. Урад здолеў пастулова знізіць тэмпы інфляцыі, забяспечыць рост заработнай платы, умацаваць рубель як плацежны сродак, папоўніць золатавалютныя рэзервы краіны.

Аднак многія праблемы так і не былі вырашаны. Эканамічная палітыка на працягу 1990-х гг. была арыентавана на экспартныя галіны вытворчасці (нафту, газ і іншыя віды сыравіны). Рэгіёны Расійскай Федэрацыі, не звязаныя з вытворчасцю сыравіны, апынуліся ў крызісным стане. Узровень вытворчасці ў іх працягваў імклівы спад. Перыядычна не выплочвалася зарплата працаўнікам цэлых галін народнай гаспадаркі, што прыводзіла да масавых антыўрадавых выступленняў. Расія траплялася ва ўсё большую залежнасць ад замежных крэдытораў.




Эканамічныя паказчыкі Расіі, % ад узроўню 1991 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Істотна ўплываў на ўнутрыпалітычную сітуацыю *чачэнскі канфлікт*, які меў глыбокія гістарычныя карані. Абвяшчэнне кіраўніцтвам Чачні поўнай незалежнасці ад Расіі прывяло да ваенных дзеянняў у ***1994—1996 гг.*** Але і пасля падпісання пагаднення аб міры гэта рэспубліка фактычна развівалася як незалежная дзяржава, і на яе тэрыторыі не спынялася тэрарыстычная дзейнасць.

У *жніўні 1998 г.* у Расіі пачаўся глыбокі фінансавы крызіс. Адбыўся спад рубля ў адносінах да долара ў 4 разы, што мела катастрафічныя наступствы для эканомікі. Гаспадарчыя адносіны па ўсёй краіне былі паралізаваны, прыпыніліся інвестыцыі (укладанні капіталу), парушылася нармальная работа банкаў, збанкрутавала мноства прадпрыемстваў і фінансавых структур. З вялікай цяжкасцю стала магчыма нармалізаваць сітуацыю і спыніць далейшы спад рубля. У жніўні 1999 г. Б. М. Ельцын прапанаваў на пасаду старшыні ўрада кіраўніка Федэральнай службы бяспекі і сакратара Савета бяспекі *У. У. Пуціна*.

**Расія ў пачатку XXI ст.** У канцы 1999 г. у палітычным жыцці Расіі адбылася важная падзея: 31 снежня тагачасны прэзідэнт Б. М. Ельцын добраахвотна пайшоў са сваёй пасады. У адпаведнасці з Канстытуцыяй выкананне прэзідэнцкіх абавязкаў было ўскладзена на старшыню расійскага ўрада. На праведзеных у сакавіку 2000 г. выбарах Прэзідэнтам РФ быў абраны ***У. У. Пуцін***.

Асноўнымі задачамі ўнутранай і знешняй палітыкі У. У. Пуціна сталі ўзмацненне ролі дзяржавы, стабілізацыя сітуацыі ў эканоміцы і эканамічны рост, барацьба з тэрарызмам, інтэграцыя з Рэспублікай Беларусь, выраўноўванне раней залежных адносін з асноўнымі краінамі Захаду.

Новая адміністрацыя павяла рашучую барацьбу супраць розных праяў сепаратызму як галоўнай пагрозы тэрытарыяльнай цэласнасці Расіі. У шэрагу суб'ектаў Расійскай Федэрацыі былі адменены заканадаўчыя акты, якія супярэчылі Канстытуцыі. Заслугай У. У. Пуціна стала канчатковае ўрэгуляванне чачэнскага канфлікту ў 2004 г.



На перагаворах прэм'ер-міністра Індыі Нарэндры Модзі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. 21 мая 2018 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Д. А. Мядзведзеў

Унутраная і знешняя палітыка РФ не змянілася і пасля выбрання ў 2008 г. Прэзідэнтам *Д. А. Мядзведзева*. У 2012 і 2018 гг. Прэзідэнтам краіны зноў быў абраны У. У. Пуцін.

Адносна ўстойліваму эканамічнаму росту Расіі ў пачатку XXI ст. садзейнічала спрыяльная сітуацыя для расійскіх тавараў і сыравіны на знешніх рынках. У краіне была ажыццёўлена зямельная рэформа, уведзена прыватная ўласнасць на зямлю. Былі прыняты законы, накіраваныя на падтрымку малога і сярэдняга бізнесу. У апошнія гады прыкметна ўзмацнілася сацыяльная накіраванасць палітыкі расійскага ўрада. Адбываецца павольнае аднаўленне жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

Нягледзячы на станоўчыя тэндэнцыі, эканоміка Расіі ўсё часцей адчувае вялікія цяжкасці. Эканамічнае развіццё па-ранейшаму мае экстэнсіўны характар, захоўваецца залежнасць краіны ад экспарту нафты, газу і іншых прыродных рэсурсаў. Сапраўдным бічом стала пашырэнне карупцыі ў дзяржаўным апараце, а таксама арганізаванай злачыннасці ў эканамічнай сферы.

**Знешнепалітычныя выклікі.** Пасля развалу СССР Расія скараціла свой ядзерны патэнцыял. Але яна па-ранейшаму мае вялікі ваенны і ядзерны арсенал, што дазваляе ёй захоўваць статус сусветнай дзяржавы. Злучаныя Штаты, яе даўні сапернік, спадзяваліся, што Расія будзе дапамагаць ім у вырашэнні разнастайных сусветных праблем. Аднак цяпер відавочна, што гэтага так і не адбылося. ЗША і многія іншыя краіны Захаду заклапочаны імкненнем Расійскай дзяржавы аднавіць сваю былую магутнасць. У сваю чаргу, Расія з хваляваннем назірае за пашырэннем НАТА на Усход, не без падстаў бачачы ў гэтым пагрозу сваёй нацыянальнай бяспецы.

1. Складзіце храналагічную табліцу палітычнага развіцця Расіі ў постперабудовачны перыяд.
2. Прасачыце эвалюцыю расійскай дзяржаўнасці ў постперабудовачны перыяд. Складзіце схему дзяржаўнага кіравання ў сучаснай Расіі.
3. Растлумачце значэнне паняцця «шокавая тэрапія». Якія наступствы мела такая палітыка ў Расіі ў 1990-я гг.?
4. Чаму ў перыяд перабудовы абвастрыліся міжнацыянальныя праблемы? У чым сутнасць чачэнскай праблемы?
5. Якія асноўныя напрамкі знешняй палітыкі РФ? Вызначце дасягненні і праблемы краіны ў міжнародных адносінах.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Ацаніце змяненні, якія адбываюцца ў Расійскай Федэрацыі ў сацыяльна-эканамічнай сферы і на міжнароднай арэне. Выкарыстайце для гэтага інфармацыю СМІ.

**Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін** (нар. 1952) — расійскі дзяржаўны і палітычны дзеяч. Скончыў юрыдычны факультэт Ленінградскага ўніверсітэта. Пасля атрымання дыплома па размеркаванні амаль 10 гадоў служыў у органах дзяржбяспекі. У 1991 г. падаў рапарт на звальненне і стаў памочнікам рэктара па міжнародных пытаннях Ленінградскага ўніверсітэта. Тады ж узначаліў Камітэт па знешніх сувязях мэрыі Санкт-Пецярбурга, а з 1994 г. стаў першым намеснікам старшыні ўрада Санкт-Пецярбурга. 26 сакавіка 2000 г. Уладзімір Пуцін абраны Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі і знаходзіцца на гэтай пасадзе да цяперашняга часу (з перапынкам: у 2008—2012 гг. прэм'ер-міністр).



# § 38. Навука і культура ў СССР і Расійскай Федэрацыі

*1. Якія мастацкі метад быў пакладзены ў аснову развіцця савецкай літаратуры і мастацтва?*
*2. Назавіце найбольш значныя дасягненні савецкай навукі міжваеннага перыяду і ў гады Вялікай Айчыннай вайны.*

Духоўнае і культурнае жыццё ў СССР у 1945—1991 гг. характарызавалася супярэчлівымі тэндэнцыямі. У пасляваенныя гады (1945—1953) зноў адбываліся рэпрэсіі, праводзіліся пастаянныя ідэалагічныя прапрацоўкі. Час «адлігі» (1953—1964) быў часам адноснай дэмакратызацыі ў грамадстве. У перыяд «застою» (1964—1985) разам з яркімі дасягненнямі ў галіне навукі і культуры назіраліся негатыўныя з'явы, як і ў цэлым у жыцці савецкага грамадства.

**Адукацыя.** Паспяховае аднаўленне народнай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд дало магчымасць значна пашырыць колькасць навучэнцаў. У снежні 1958 г. быў прыняты закон, згодна з якім замест сямігадовай адукацыі ўводзілася ўсеагульная абавязковая васьмігадовая адукацыя.

Правообладатель Издательский центр БГУ